# КАГНІТЫЎНАЯ ЛІНГВІСТЫКА

# ЛЕКЦЫЯ 1-2.

## МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КАГНІТЫЎНАЙ ЛІНГВІСТЫКІ

Працэсы, звязаныя з веданнем і інфармацыяй, называюцца кагнітыўнымі (cognition - пазнанне).

***<u>Кагнітыўная навука</u>*** – навуковы напрамак, у межах якога даследуюцца працэсы засваення, назапашвання і выкарыстання інфармацыі чалавекам.

Да зыходных паняццяў кагнітыўнай навукі належаць *«пазнанне», «інфармацыя», «веды»*.

*Пазнанне* - працэс адлюстравання ў свядомасці рэчаіснасці, у выніку якога адбываецца назапашванне ведаў.

*Інфармацыя*- паведамленне аб фактах, падзеях, працэсах; веды, якія прадстаўляюцца і перадаюцца моўнымі структурамі ў працэсе камунікацыі.

*Веды* - частка памяці; змяшчаюць у свядомасці выніку адлюстравання аб'ектаў рэчаіснасці, аб'яднаныя ў сістэму.

Мова з'яўляецца найважнейшым звяном у назапашванні і катэгарызацыі ведаў. Кагнітыўная лінгвістыка (канец XX стагоддзя) разглядае мову як форму інтэлектуальнай дзейнасці чалавека, у якой замацаваліся вынікі пазнавальнай дзейнасці. Кагнітыўная лінгвістыка грунтуецца на палажэнні аб тым, што паводзіны і дзейнасць чалавека вызначаюцца ў значнай ступені яго ведамі, а моўныя паводзіны - моўнымі ведамі.

*<u>Мэта кагнітыўнай лінгвістыкі</u>* - зразумець, як ажыццяўляюцца працэсы ўспрымання, катэгарызацыі, класіфікацыі і асэнсавання свету; як адбываецца назапашванне ведаў; якія сістэмы забяспечваюць розныя віды дзейнасці з інфармацыяй.

Даследаванні сучаснай кагнітыўнай лінгвістыкі вядуцца ў асноўным па наступных напрамках:

- віды і тыпы ведаў, якія змяшчаюцца ў моўных знаках, і механізм атрымання са знакаў пэўных ведаў (г. зн. правілы інтэрпрэтацыі);
- умовы ўзнікнення і развіцця знакаў і законы, якія рэгулююць іх функцыянаванне;
- суадносіны моўных знакаў і культурных рэалій, адлюстраваных у іх.

У адрозненне ад іншых кагнітыўных навук (кагнітыўнай псіхалогіі, нейранавук, тэорыі інфармацыі, кібернетыкі і інш.) ***прадметам*** вывучэння кагнітыўнай лінгвістыкі з'яўляецца не самі веды (пазнанне), а мова як агульны механізм набыцця, выкарыстання, захоўвання, перадачы і выпрацоўкі ведаў.

Галоўнай ***задачай*** кагнітыўнай лінгвістыкі з'яўляецца сістэмнае апісанне і тлумачэнне механізмаў чалавечага засваення мовы і прынцыпы структуравання гэтых механізмаў.